**«МІНСК-АРЭ́НА»**, шматфункцыянальны культурна-спартыўны комплекс. Пабудаваны ў 2006—09 у Мінску (архіт. А.Нічкасаў, В.Куцко, У.Будаеў, А.Шабалін, А.Ніціеўскі, В.Нікіцін). У аснову маст. вобраза пакладзена стылізаваная форма шайбы, якая сімвалізуе зімовыя віды спорту. Комплекс уключае спарт.-відовішчную арэну, злучаную падземным пераходам з канькабежным стадыёнам, веладром і аўтастаянку на 1080 месцаў. Цыліндрычны, круглы ў плане аб'ём спарт.-відовішчнай арэны дыяметрам 128 м (8 узроўняў) выкананы ў канструкцыях з маналітнага жалезабетоннага каркаса з 2-паясным вантавым пакрыццём. Фасады



*Культурна-спартыўны комплекс «**Мінск-Арэна**».*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аздоблены сэндвіч-панэлямі блакітна-серабрыстых тонаў з рытмічнай перабіўкай зашклёнымі ўчасткамі і вузкімі стужачнымі вокнамі таніраванага шкла, цокальныя паверхі абліцаваны светла-шэрым гранітам. У цэнтры — лядовае поле (1600 $м^2$). Зала спарт.-відовішчнай арэны аснашчана трыбунамі на 15 тыс. месцаў, з іх 7 радоў ніжняга яруса трансфармуюцца. На 1—3-м паверхах размешчаны залы трэнажорная, трэніровачная, харэагр., пасяджэнняў судзебнай камісіі, прэс-цэнтр, буфеты, гардэроб, на 4—5-м — VIP-ложы з пакоямі для адпачынку, на 6-м — рэстараны на 112 і 132 месцаў, на 7—8-м — службова-тэхн. памяшканні. Перад гал. уваходам — алея спарт. славы з фантанамі. Тут праводзяцца спарт. спаборніцтвы рэсп. і міжнар. ўзроўняў, трэніроўкі, канцэрты, шоу.

*Ю.Ю.Захарына.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ